## ФОТАФАКТ

Напярэдадні Дня настаўніка ў сярэднюю школу № 109 Мінска завітаў з канцэртам-віншаваннем калектыў "Гармонія" Асацыяцыі фалькларыстаў Беларусі (мастацкі кіраўнік М.Слізкі, музычны — В.Ляўчук). Менавіта ў гэтай школе працаваў настаўнікам Іван Цітавец, тут пачыналася яго паэтычная дзейнасць. Гучалі словы ягоных вершаў "Настаўніца", "Пралескі", "Школа".

Гэта ім, нястомным працаўніцам, сціплым жанчынам, добрым настаўніцам, што ахвяравалі сваё жыццё дзецям, падараваў вянок лірычных песень на словы Івана Цітаўца самадзейны кампазітар Міхась Слізкі. "Жыта", "Каліна", "Рэчка Можа", "Радзіма" ў выкананні салістак "Гармоніі" Валянціны Ляўчук, Святланы Сачак, Святланы Хілько прыемна ўразілі прысутных, настроілі іх на лірычны лад. А колькі народных песень і танцаў ведаюць дырэктар школы А.Шандора, арганізатар пазашкольнай работы В.Герасімчык, завуч В.Абрамовіч, настаўніцы В.Ягоўдзік, Л.Шахоўцава. Вясёлыя полькі і кадрылі змяняліся вальсамі, былі конкурсы прыпевак і загадак, танцаў. Доўга весялілі прысутных Іна Паціменка, Вольга Шэлег — таленавітыя музыкі "Гармоніі".



РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ